# ФІНАЛЬНЫ ПАЛЕАЛІТ І МЕЗАЛІТ БЕЛАРУСКАГА ПАНЯМОННЯ: СТАН ДАСЛЕДАВАННЯЎ

**В. У. Ашэйчык**

Эпоха фінальнага палеаліту – найстаражытнейшы этап гісторыі на тэрыторыі Заходняй Беларусі, які прыпадае на перыяд позналедавікоўя. Менавіта ў гэты час (X–VIII тысячагоддзі да н.э.), калі пасля адступлення апошняга ледавіка з тэрыторыі нашай краіны складваюцца спрыяльныя для жыцця людзей прыродныя ўмовы, адбываецца першапачатковае засяленне Беларускага Панямоння чалавечымі супольнасцямі паляўнічых на паўночнага аленя. У выніку кліматычных зменаў у час наступлення пасляледавіковай эпохі, эпохі геалагічнай сучаснасці – галацэну, – тэрыторыя, якая ў папярэднія часы ляжала ў зоне перыгляцыяльнага тундра-стэпу, зарастае лясамі і засяляецца новымі, ляснымі відамі жывёл. Змены экалагічнага асяроддзя паўплывалі на развіццё чалавечых супольнасцяў, у сувязі з чым VIII–V тысячагоддзі да н.э. называюцца даследчыкамі эпохай мезаліту.

У гэтым артыкуле аўтар мяркуе ахарактарызаваць сучасны стан даследаванняў дзвюх пачатковых эпох гісторыі Беларускага Панямоння, для чаго неабходна спыніць увагу на дзвюх праблемах: гісторыі археалагічнага вывучэння старажытнасцей і стан крыніцазнаўчай базы для вывучэння фінальнага палеаліту і мезаліту Беларускага Панямоння.

**Гісторыя археалагічнага вывучэння** тэрыторыі Беларускага Панямоння налічвае больш за 100 гадоў. Некалькі дзесяткаў помнікаў эпохі фінальнага палеаліту і мезаліту было выяўлена і часткова даследавана ў канцы XIX – першай палове XX стст. намаганнямі Вандаліна Шукевіча, Зыгмунта Глогера, Міхала Федароўскага, Ірэны і Людвіка Савіцкіх, Юзафа Ядкоўскага, Зыгмунта Шміта, Уладімежа Антаневіча. Археалагічныя матэрыялы, сабраныя гэтымі даследчыкамі большай часткай захоўваюцца ў музеях Польшчы. Частка з іх апублікавана ў працы З. Сульгастоўскай [1, s. 127–137], а матэрыялы, што захоўваюцца ў Дзяржаўным археалагічным музеі ў Варшаве на высокім прафесійным узроўні апрацаваны і апублікаваны В.С. Абухоўскім [2].

Новы этап даследаванняў распачынаецца пасля Другой сусветнай вайны. У 1950–1960-х гг. на тэрыторыі Беларускага Панямоння археалагічнымі пошукамі займаліся Н.М. Гурына, Ф.Д. Гурэвіч, Л.С. Клейн, А.Р. Мітрафанаў, С.Н. Тараканава, З.М. Цюрына.

Л.С. Клейнам у выніку разведак у 1957–1958 гг. было выяўлена больш за два дзесяткі месцазнаходжанняў крамянёвых вырабаў. На жаль сабраная калекцыя была згублена, а ў наяўнай справаздачы не стае інфармацыі, каб зрабіць хоць якія канкрэтныя высновы аб культурнай ці храналагічнай прыналежнасці выяўленых помнікаў, частка з якіх, верагодна, павінна адносіцца да эпохаў фінальнага палеаліту і мезаліту [3].

У 1957–1964 гг. Н.М. Гурына знайшла і часткова даследавала каля 50 помнікаў каменнага і бронзавага вякоў, сярод якіх было і больш за дзесятак фінальнапалеалітычных і мезалітычных стаянак. Вынікі гэтых даследаванняў апублікаваны [4; 5; 6].

У першай палове 1960-х гг. да вывучэння помнікаў каменнага веку басейну Нёмана прыступіў М.М. Чарняўскі, які, ў тым ліку, правёў раскопкі фінальнапалеалітычных стаянак Кавальцы 2 і мезалітычных – Беліца 2, Лічыцы 2, Нясілавічы 1 [7; 8; 9].

У 1980–1990-я гг. мезалітычныя помнікі на р. Шчара раскопвала Н.У. Шаблюк, а В.Я. Кудрашоў і В.Л. Ліпніцкая даследавалі комплекс стаянак каля Краснасельскіх крэмнездабыўчых шахт [7].

У 1990-я гг. пачаў сваю навуковую дзейнасць В.С. Абухоўскі, які ў 1998 г. абараніў у Варшаўскім універсітэце магістэрскую дысертацыю па тэме «Фінальны палеаліт і мезаліт правабярэжнага басейна верхняга Нёмана» («Shyłkowy paleolit i mezolit prawobrzeżnej strefy dorzecza górnego Niemna»); ў наступныя гады даследчык працаваў над доктарскай дысертацыяй па тэме «Фінальны палеаліт і мезаліт Заходняй Беларусі» («Shyłkowy paleolit i mezolit zachodnej Białorusi»). З 1997 па 2007 гг. В.С. Абухоўскі вёў актыўныя археалагічныя пошукі на тэрыторыі Заходняй Беларусі, у выніку якіх было выяўлена і абследавана больш за сотню новых помнікаў каменнага і бронзавага вякоў, а шэраг стаянак з палеалітычным і мезалітычным матэрыялам быў даследаваны раскопкамі – Бершты 6, Кавальцы 1, 2 і 4, Жылічы 1, Хамуты 5, Нямнова 1 і інш. [10; 11; 12; 13; 14; 15; 16; 17].

**Стан крыніцазнаўчай базы.** За гады археалагічнага вывучэння Беларускага Панямоння па прыблізных падліках аўтара было выяўлена і абследавана каля 200 фінальнапалеалітычных і мезалітычных помнікаў, у выніку чаго сабраныя досыць вялікія калекцыі археалагічнага матэрыялу, якія зараз месцяцца ў фондасховішчах Інстытута гісторыі НАН Беларусі, музеяў Беларусі, а таксама ў музеях Польшчы, Літвы і Расіі.

Для кароткай характарыстыкі стану крыніцазнаўчай базы варта звярнуць увагу на шэраг аспектаў.

1. Большасць сабраных матэрыялаў не ўведзена ў навуковы зварот. На цяперашні момант прафесійна і поўна апрацаваны і апублікаваны

археалагічныя калекцыі даваенных збораў з тэрыторыі Беларусі, якія захоўваюцца ў Варшаве [1, s. 127–137; 2]; матэрыялы з раскопак стаянак Красносельскі 5, 6, 7, Красносельскі-Селішча, Лічыцы 2 [7; 9, с. 72–73, мал. 28], Бершты 6 [10]; павярхнёвыя зборы Н.М. Гурынай са стаянак каля воз. Свіцязь, в. Нясілавічы, в. Чарлёнка і яшчэ шэрагу стаянак у Панямонні – Нёман 2, 6, 18 [4; 5; 6]; павяхнёвыя зборы А. Гутоўскага каля в. Цыганаўка [18]. Некалькі помнікаў, што даследаваліся раскопкамі, апублікаваны толькі часткова – Беліца 2 [9, с. 68–71, мал. 26], Кавальцы 2 [8, с. 32–34, мал. 10], Нясілавічы 1 [5, с. 163–166, рис. 13, 14; 19, с. 60–61, табл. 34; 9, с. 71–72, мал. 27].

2. Асноўная колькасць вядомых помнікаў фінальнага палеаліту і мезаліту даследавалася павярхнёвымі зборамі, толькі некаторыя раскопваліся. Інфармацыйнасць калекцый, атрыманых зборамі з паверхні, ці нават раскопкамі без дакладнай прасторавай фіксацыі знаходак, вельмі абмежаваная. Не ўяўляецца магчымым на падставе толькі такіх калекцый рабіць праўдападобныя і аргументаваныя культурна-храналагічныя інтэрпрэтацыі археалагічнага матэрыялу.

3. Абсалютная большасць вядомых на сёння помнікаў фінальнага палеаліту і мезаліту – пясчаніковыя стаянкі з парушанай стратыграфіяй, што ў старажытныя часы неаднаразова засяляліся носьбітамі розных культур з розных археалагічных перыядаў. Таму нават раскопкі такіх помнікаў даюць змяшаныя рознакультурныя калекцыі, матэрыял якіх вельмі складана, а часам і зусім немагчыма, раздзяляць на таксаманічныя групы. Адпаведна, амаль немагчыма выдзеліць поўныя і чыстыя комплексы матэрыяльных рэшткаў розных археалагічных культур, без чаго, у сваю чаргу, не ўяўляецца магчымай распрацоўка схем перыядызацыі і развіцця культур фінальнапалеалітычных і мезалітычных супольнасцяў.

**Высновы:** 1. Нягледзячы на тое, што гісторыя археалагічнага даследавання помнікаў каменнага веку беларускага Панямоння налічвае больш за 100 гадоў, эпохі фінальнага палеаліту і мезаліту на гэтай тэрыторыі вывучаны даволі слаба, што выяўляецца ў малой колькасці даследаваных раскопкамі помнікаў, а таксама ў наяўнасці літаральна некалькіх абагульняючых прац па гэтай тэме [8; 9; 19; 20; 21].

2. Назапашаныя крыніцы па тэме, па-першае, вызначаюцца неаднароднасцю сваёй крыніцазнаўчай вартасці. Па-другое, наяўныя археалагічныя матэрыялы большай часткай не апублікаваны і, такім чынам, не ўведзены ў навуковы зварот.

3. У перспектыве далейшай распрацоўкі тэмы неабходна, па-першае, навуковая апрацоўка ўжо назапашаных у фондах музеяў і навуковых

устаноў калекцый археалагічнага матэрыялу з дапамогай найноўшых методык даследавання – у прыватнасці, тэхніка-тыпалагічнага і трасалагічнага метадаў. Па-другое, у палявых даследаваннях неабходна сканцэнтравацца на пошуку добрастратыфікаваных стаянак і іх даследаванні з прыцягненнем спецыялістаў прыродазнаўчых навук – геолагаў, палінолагаў і інш.

**Літаратура**


1. *Sulgostowska Z.* Prahistoria międzyrzecza Wisły, Niemna i Dnestru u schyłku plejstocenu. Warszawa, 1989.
2. *Obuchowski W.* Zabytki krzemienne i kamienne od paleolitu do wczesnej epoki żelaza z terenów Białorusi w zbiorach Państwowego Muzeum Archeologicznego w Warszawie. Warszawa, 2003.
3. *Клейн Л. С.* Отчёт обследования стоянок каменного века Славяно-Литовским отрядом Прибалтийской экспедиции в 1958 г. / Архіў Інстытута гісторыі НАН Беларусі. Справа № 178. Мн., 1958 г.
4. *Гурина Н.Н.* Новые мезолитические памятники лесной полосы европейской части СССР // Сов. археология. 1960. № 1.
5. *Гурина Н. Н.* Новые данные о каменном веке Северо-Западной Белоруссии // МИА. № 131. 1965. С. 141–203.
6. *Гурина Н. Н.* К вопросу о позднепалеолитических и мезолитических памятниках Польши и возможности сопоставления с ними памятников Северо-Западной Белоруссии // МИА. № 126. 1966. С. 14–34.
7. *Чарняўскі М. М., Кудрашоў В. Я., Ліпніцкая В. Л.* Старажытныя шахцёры на Росі. Мн., 1996.
8. *Чарняўскі М. М.* Помнікі лінгбійскай культуры // Археалогія Беларусі: У 4 т. Т. 1. Каменны і бронзавы вякі. Мн., 1997. С. 31–35.
9. *Чарняўскі М. М.* Яніславіцкая культура // Археалогія Беларусі: У 4 т. Т. 1. Каменны і бронзавы вякі. Мн., 1997. С. 67–76.
10. *Абухоўскі В.* Раскопкі стаянкі Бершты IV // ГАЗ. № 14. 1999. С. 48–53.
11. *Barska K., Łakiza V., Migal W., Obuchowski W.* Najnowsze badania nad epoką kamienia na Wysoczyźnie Grodzieńskiej // Materiały konferencji: Badania archeologiczne w Polsce północno-wschodniej i na zachodniej Białorusi, sezony 2000-2001, Białystok, 6-7 grudnia 2001. Białystok, 2002. S. 111–116.
12. *Абухоўскі В., Лакіза В.* Археалагічныя даследаванні на тэрыторыі Беларускага Панямоння ў 2002 годзе // ГАЗ. № 18. 2003. С. 262–264.
13. *Лакіза В., Абухоўскі В., Мігаль В., Барска К.* Археалагічныя разведкі 2003 г. ў басейне Нёмана // ГАЗ. № 19. 2004. С. 276–277.
14. *Абухоўскі В., Калечыц А., Лакіза В., Чарняўскі Макс., Чарняўскі Міх.* Археалагічнае абследаванне ўзбярэжжаў Нёмана ў зоне будаўніцтва Гродзенс кай ГЭС // ГАЗ. № 19. 2004. С. 272–273.
15. *Лакіза В., Абухоўскі В.* Археалагічныя разведкі на Беларускім Панямонні // ГАЗ. № 20. 2005. С. 225–227.
16. *Абухоўскі В., Калечыц А., Лакіза В., Чарняўскі Міх.* Раскопкі на Аўгустоўскім канале // ГАЗ. № 21. 2006. С. 179–180.

17. *Лакиза В., Обуховский В.* Исследования в зоне реконструкции Августовского канала // АО 2005 года. М., 2007. С. 582–584.
18. *Гутовский А. М.* Мезолитическая стоянка Цыгановка в Среднем Понеманье // Древности Литвы и Белоруссии / Под ред. Л.Д. Поболя, А.З. Таутавичюса. – Вильнюс, 1988. С. 3–7.
19. *Кольцов Л. В.* Мезолит Литвы и Белоруссии. Яниславицкая культура // Археология СССР. Мезолит СССР. М., 1989. С. 60–62.
20. *Абухоўскі В. С.* Засяленне тэрыторыі Беларускага Панямоння ў X—V тыс да н.э. // Культура Гродзенскага рэгіёну: праблемы развіцця ва ўмовах поліэтнічнага сумежжа. Гродна, 2003. С. 182–188.
21. *Абухоўскі В. С.* Палеаліт Беларусі – сучасны стан і перспектыва даследаванняў // Wspólnota dziedzictwa kulturowego ziem Białorusi i Polski. – Warszawa, 2004. – S. 67–79.

# ШУМЕРСКОЕ UNKEN И СОПУТСТВУЮЩАЯ ЛЕКСИКА, КАСАЮЩАЯСЯ ИНСТИТУТА СОБРАНИЯ В ДРЕВНЕМ ШУМЕРЕ (III ТЫС. ДО Н.Э.)

**В. В. Бартош**

Как известно, двумя экономическими субъектами в Месопотамии III тыс. являлись царско-храмовое и общинное хозяйство. Разделение экономики Месопотамии на два сектора прослеживается на протяжении всей истории этого региона. Как указывал И.М. Дьяконов «общинный строй был гораздо более живуч [чем в Египте – *В.Б.*] (масса свободного населения месопотамских «номов» была прямым продолжением первобытного населения общины)» [1, с. 77]. В некоторые периоды месопотамской истории община была довольно сильна (Раннединастический, ок. 2750–2315 гг. до н.э.), были периоды почти полного подчинения общины царской администрации (Третья династия Ура, ок. 2106–2003 до н.э.).

Исследователь, желающий изучить общину в древнем Шумере, сталкивается со следующей трудностью. Около девяноста процентов шумерских текстов составляют документы экономического и административного характера [7, p. 359] – отчётности, расписки, списки продуктов, людей и т.д. Однако эти тексты происходят из больших храмовых архивов. Дьяконов указывает, что в хозяйствах большесемейных документального учёта не велось, однако это не может указывать на то, что самих этих хозяйств не было [3, с. 188]. Т.о. общину в древнем Шумере изучать крайне проблематично.

*Проблему источников* для исследования общины в древнем Шумере можно решить двояко:

Во-первых, как предлагает Дьяконов, к исследованию общины необходимо подключить эпос и религиозные тексты, которые отражают со-